ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“ВАЎКАВЫСКАЯ ДАПАМОЖНАЯ ШКОЛА-ІНТЭРНАТ”

# АПІСАННЕ ВОПЫТУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ “ФАРМІРАВАННЕ ЎСТОЙЛІВАГА ПАЗНАВАЛЬНАГА ІНТАРЭСУ Ў ВУЧНЯЎ З ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ НЕДАСТАТКОВАСЦЮ ДА АВАЛОДАННЯ РОДНАЙ МОВАЙ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ ФАЛЬКЛОРУ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ”

Мелеш Аксана Васільеўна,
настаўнік дапаможнай школы
8029 869 83 45
e-mail: melesh1980@mail.ru

2019

## 1.Інфармацыйны блок

### 1.1 Назва тэмы вопыту

Фарміраванне ўстойлівага пазнавальнага інтарэсу ў вучняў з інтэлектуальнай недататковасцю да авалодання роднай мовай праз выкарыстанне фальклору на ўроках літаратурнага чытання.

### 1.2 Актуальнасць вопыту

Ва ўсіх цывілізаваных грамадствах адукацыя грунтуецца на нацыянальнакультурным падмурку. Гэта пацвярджаецца і Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, дзе ў якасці аднаго з асноўных прынцыпаў названа нацыянальна-культурная аснова. Навучальная парадыгма з апорай на этнакультуру, на фальклор як сродак адукацыі – унікальная адметнасць нацыянальнай сістэмы адукацыі.

Сучасныя педагагічныя рэаліі патрабуюць улічваць у адукацыі этнакультурны фактар, ствараць умовы для пазнання нацыянальнай культуры, для вывучэння роднай мовы. Беларускі пісьменнік Хведар Чэрня пісаў: “Вучаць у школе замежныя мовы дзеці. А з хваляваннем жыву: як бы яны не забыліся словы тыя, што родную зораць канву” [ 5, с.15].

Галоўная мэта вывучэння беларускай мовы ў дапаможнай школе - навучыць дзяцей практычнаму карыстанню беларускай мовай, сфарміраваць камунікатыўную кампетэнцыю ў вучняў, г. зн. навучыць іх слухаць і разумець беларускае маўленне, размаўляць па-беларуску, чытаць і пісаць на роднай мове.

Літаратурнае чытанне з’яўляецца неабходнай састаўной часткай маўленчай дзейнасці вучняў, служыць дзейсным сродкам сацыялізацыі, выхавання і развіцця асобы.

Якім павінен быць урок літаратурнага чытання для дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю? Якім павінна быць навучанне, каб яно падахвочвала вучняў да вывучэння роднай мовы, фарміравала пазнавальную актыўнасць, рабіла іх не пасіўнымі гледачамі на ўроку, а актыўнымі ўдзельнікамі? Гэтыя пытанні сталі перада мной, як толькі мне давялося пачаць выкладаць беларускую мову ў дапаможнай школе. Лічу, што немагчыма

дабіцца поспехаў у рашэнні гэтых задач без фарміравання і развіцця ўстойлівага пазнавальнага інтарэсу вучняў да вывучаемага матэрыялу. Выкарыстанне фальклору, звяртанне да народна-прыкладнога мастацтва і рамёстваў, неабходнасць па-новаму, асэнсавана глянуць на багатую беларускую культуру з’яўляецца адным са сродкаў павышэння інтарэсу вучняў да вывучэння роднай мовы.

**1.3 Мэта вопыту:**

фарміраванне ўстойлівага пазнавальнага інтарэсу вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю на ўроках літаратурнага чытання шляхам выкарыстання фальклору.

**1.4 Задачы вопыту**:

1. падабраць і апрабіраваць найбольш эфектыўныя метады і прыёмы выкарыстання фальклору пры авалоданні роднай мовай;
2. укараніць на ўроках літаратурнага чытання ў VI-X класах сістэму работы, якая забяспечыць фарміраванне ўстойлівага пазнавальнага інтарэсу да вывуння беларускай мовы, развіццё нацыянальнай самасвядомасці вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю;
3. ацаніць эфектыўнасць выкарыстання фальклору як сродка фарміравання пазнавальнага інтарэсу вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю да вывучэння беларускай мовы.

**1.5 Працягласць работы над вопытам:**

Праца над вопытам ахоплівае перыяд з 2015 па 2018 гг. Для сябе я акрэсліла асноўныя этапы работы.

1. Праектны этап. Вывучэнне літаратуры па тэме праблемы. Падбор фальклорнага матэрыялу, даступнага вучням дапаможнай школы. Вывучэнне перспектыўнага педагагічнага вопыту.

2. Рэалізацыйны этап. Рэалізацыя абранай праблемы на ўроках літаратурнага чытання. Падбор і апрабацыя найбольш эфектыўных метадаў і прыёмаў выкарыстання фальклору для павышэння пазнавальнага інтарэсу

вучняў пры вывучэнні роднай мовы. Накапленне метадычнага і фальклорнага матэрыялу ў школьным этнаграфічным пакоі “Беларуская хатка”.

3. Дыягнастычны этап. Аналіз і абагульненне вынікаў эфектыўнасці выкарыстання фальклору на ўроках літаратурнага чытання як сродка павышэння пазнавальнай актыўнасці вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю да вывучэння беларускай мовы. Укараненне вопыту выкарыстання фальклорных сродкаў ў вучэбнай і выхаваўчай рабоце ўстановы.

**2. Апісанне тэхналогіі вопыту**

**2.1 Вядучая ідэя вопыту**

Рацыянальнае выкарыстанне фальклору на ўроках літаратурнага чытання дазваляе стварыць умовы для фарміравання ўстойлівага пазнавальнага інтарэсу ў вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю да вывучэння беларускай мовы.

**2.2 Апісанне сутнасці вопыту**

У дапаможнай школе існуе праблема авалодання беларускай мовай. Як паказваюць мае назіранні, дзеці без задавальнення ідуць на ўрок, мала ведаюць вершаў на памяць, маюць бедны лексічны запас, складаюць сказы са шматлікімі памылкамі. На мой погляд, для большасці вучняў авалоданне беларускай мовай можна параўноўваць з вывучэннем замежнай.

Заўважыўшы ў вучняў VI-X класаў цяжкасці пры вывучэнні беларускай мовы, вырашыла ваявіць узровень інтарэсу да ўрокаў беларускай мовы і літыратурнага чытання. У сваім даследаванні выкарыстоўвала наступную сукупнасць метадаў: анкеціраванне, гутарка, назіранне. Правяла дыягностыку цікавасці да прадмета па методыцы "Складзі расклад на заўтра", дзе прапанавала навучэнцам самастойна выбраць урокі, на якіх яны б прысутнічалі. У выніку толькі каля 40% вучняў старэйшых класаў уключылі ў свой расклад урокі літаратурнага чытання або беларускай мовы.

Вывучэнне узроўняў сфарміраванасці пазнавальнага інтарэсу (Дадатак 1) ажыццяўляла з дапамогай методыкі анкетавання Г.І.Шчукінай [9]. Навучэнцам прапанавала запоўніць бланк анкеты (Дадатак 2), вынікі якой адлюстравала ў дыяграме. (Дадатак 3)

Зацікавіўшыся праблемай фарміравання устойлівага пазнавальнага інтарэсу да вучэбнай дзейнасці, стала вывучаць літаратуру па дадзенай тэме.

Пазнавальная дзейнасць - шматгранная і рознаструктурная з'ява ў працэсе навучання. Важнейшай яе структурнай адзінкай з'яўляецца пазнавальны інтарэс.

Праведзеныя А.М. Лявонцьевым даследаванні паказалі, што пазнавальны інтарэс - моцны матыў навучання, які робіцца ўстойлівым утварэннем самой асобы, магутнай заахвочвальнай сілай яе дзейнасці і асобных дзеянняў.

Ян Амос Каменскі, які здзейсніў рэвалюцыю ў дыдактыцы, разглядаў новую школу як крыніцу радасці, святла і ведаў, лічыў інтарэс адным з галоўных шляхоў стварэння гэтай светлай і радаснай атмасферы навучання. Ж.Ж. Русо, абапіраючыся на непасрэдны інтарэс вучня да прадметаў і з'яў, спрабаваў будаваць даступнае і прыемнае дзіцяці навучанне. К.Д. Ушынскі ў інтарэсе бачыў асноўны ўнутраны механізм паспяховага вучэння. Ён паказаў, што знешні механізм прымусу не дасягае патрэбнага выніку. Нават І.Ф.Гербарт, прызнаючы інтарэс іманентнай уласцівасцю, заклікаў настаўніка не быць сумным, а засноўваць навучанне на інтарэсах, уласцівых дзіцяці [6, 7].

Сучасная дыдактыка, абапіраючыся на самыя новыя дасягненні педагогікі і псіхалогіі, бачыць у інтарэсе яшчэ больш магчымасцяў і для навучання, і для развіцця, і для фарміравання асобы вучня ў цэлым.

Характарызуючы вучня з інтэлектуальнай недастатковасцю, Л. В. Занкоў таксама звяртае ўвагу на тое, што ў многіх з іх вельмі мала развіта дапытлівасць, назіраецца нізкі узровень жадання да ажыццяўлення новых відаў дзейнасці. Але мы ведаем, што кожны аб'ект, які задавальняе тую ці іншую патрэбнасць чалавека, выклікае станоўчыя перажыванні. У мэтах фарміравання пазнавальных інтарэсаў, неабходна выклікаць гэтую станоўчую эмацыйна афарбаваную рэакцыю.

Такім чынам, у вучняў з інтэлектуальнай недастаковасцю, пазнавальны інтарэс будзе выступаць як найкаштоўнейшы матыў вучэбнай дзейнасці, і гэта найбольш істотная яго праява.

Відавочна, што вучня нельга вучыць паспяхова, калі ён абыякавы да навучання. У пошуках разнастайных формаў і метадаў работы па фарміраванні пазнавальнага інтарэсу да навучання на ўроках літаратурнага чытання звярнула ўвагу на выкарыстанне фальклору.

Фальклор - сукупнасць розных відаў народнага мастацтва, такіх як вусна-паэтычная творчасць, народная музыка, танцы, разнастайныя віды прыкладнога мастацтва, народны тэатр [3].

Фальклорныя творы, якія выкарыстоўваю на сваіх ўроках, з'яўляюцца даступымі, адпавядаюць узроставым і псіхалагічным асаблівасцям дзяцей, зручныя для першапачатковага знаёмства з літаратурнымі паняццямі, дазваляюць развіваць творчыя здольнасці вучняў (развіццё мовы і элементарная славесная творчасць). Калыханкі, забаўлянкі, прымаўкі, песні, казкі - вось тыя дасканалыя мастацкія формы фальклору, з дапамогай якіх імкнуся знаёміць вучняў з багаццем і разнастайнасцю беларускай культуры.

Адзін з раздзелаў вучэбнай праграмы прадмета "Літаратурнае чытанне", які мае назву "З народных вытокаў", прысвечаны вывучэнню фальклора. Ў сваёй педагагічнай дзейнасці імкнуся выкарастоўваць элементы вуснай народнай творчасці больш шырока, на розных этапах урока: пры арганізацыі пачатку урока, кантролі ведаў, паведамленні тэмы урока, вывучэнні новага, замацаванні вывучаннага, падвядзенні выніку ўрока.

Далучэнне вучняў да беларускага фальклору пачала з праслухоўвання і абыгрывання ў VI класе беларускіх народных калыханак, песень, забаўлянак, кароткіх вершыкаў, да якіх далучаюцца адпаведныя зместу дзеянні і рухі. Вялікае значэнне пры гэтым маюць тыя забаўлянкі, якія суправаджаюцца разнастайнымі рухамі пальцаў рук, напрыклад: "Сарока-варона кашу варыла", "Чыкі, чыкі, сарока". Важнасць іх знаходзіцца ў паралельным развіцці дыферэнцыраваных рухаў пальцаў рук і маўлення, што стымулюе і актывізуе маўленне вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю. Маўленчая сітуацыя дазваляе дзецям зразумець інструкцыю настаўніка, стварае сітуацыю поспеха.

Калыханкі - адзін з найстаражытнейшых песенных жанраў. Да нашых дзён не толькі ў фальклорных запісах, але і проста ў сямейнай памяці захавалася значна больш калыханак, чым забаўлянак. Магчыма, гэта абумоўлена іх вялікім практычным значэннем, магчыма - дакладнасцю рыфмаў, простым зместам і нескладаным рытмам верша, якія спрыяюць лёгкаму запамінанню. Вучні з задавальннем завучваюць калыханкі на памяць, сцяваюць іх разам з настаўнікам.

Часта на сваіх уроках выкарыстоўваю лічылкі. Напрыклад, для размеркавання роляў пры чытанні па ролях або інсцэніраванні. Спачатку прагаворваю лічылкі сама, а з цягам часу гэта могуць ужо рабіць і дзеці.

Выкарыстанне ў працы заклічак дапамагло мне не толькі сфарміраваць цікавасць да народнай творчасці, роднай мовы, культуры беларусаў, але і прыцягнуць увагу дзяцей да прыроды, да самастойных назіранняў.

Загадкі, якія выкарыстоўваю на сваіх уроках, служаць сродкам развіцця мыслення, абагачэння лексічнага запаса вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю, развіцця назіральнасці і кемлівасці. Выкарыстоўваю іх практычна на кожным этапе ўрока: для праверкі ведаў, для паведамлення новай тэмы або пры падвядзенні выкікаў урока. Каштоўнасць загадак бачу ў тым, што вучні пачынаюць разважаць, іх увага накіравана на прыкметы прадметаў і з'яў, развіваецца ўяўленне.

Мудрасць народа зафіксавана ў прымаўках і прыказках. Яны з даўніх часоў прысутнічаюць ў практыцы перадавых педагогаў. Работа над разуменнем прыказак і прымавак вельмі складаная для вучняў дапаможнай школы, так як патрабуе пэўнага ўзроўню развіцця мыслення. Улічваючы гэта, ў сваёй педагагічнай дзейнасці вельмі адказна стаўлюся да падбору фальклорнага матэрыялу, пры ўзнікненні цяжкасцей, задаю ўдакладняючыя пытанні. Выкарыстоўваю на ўроках такія формы, як: праца над разуменнем сэнса прыказак і прымавак; складанне апавядання па прыказцы; драматызацыя прапанаванага апавядання па прыказцы; падбор прыказак да апавядання; аднаўленне прыказкі з пераблытаных слоў; складанне прыказкі па тэме; збор

прыказак на адну тэму; аднаўленне прыказкі па малюнку; знаходжанне прыказкі ці прымаўкі да малюнка; маляванне малюнкаў да прыказкі ці прымаўкі. Выкарыстанне прыказак і прымавак садзейнічае актывізацыі вучняў, пывышэнню ўвагі, развіццю мовы і мыслення, дапамагае вырашэнню выхаваўчых задач, спрыяе нацыянальнай ідэнтыфікацыі навучэнцаў.

Казка – адзін з любімых дзецьмі жанраў мастацкіх твораў. Дзеці любяць яе яркасць, вобразнасць і акрэсленасць характараў, за прастату зместу і за багатую каларытную народную мову. Казкі вучаць працавітасці, сціпласці, ветлівасці, справядлівасці, мужнасці, асуджаюць несправядлівасць, сквапнасць і іншыя недахопы людзей. Усе гэта робіць казку магутным сродкам выхавання лепшых чалавечых якасцей, садзейнічае карэкцыі ўсіх псіхічных працэсаў і фарміраванню інтарэсу да вывучэння роднай мова.

У сваёй практыцы выкарыстоўваю шмат разнастайных метадаў і прыёмаў работы над казкай. Гэта не толькі стандартныя прыёмы работы, якія, на маю думку, не могуць у поўнай ступені садзейнічаць развіццю ўяўлення вучняў, але і шэраг нестандартных прыёмаў работы з казкай, накіраваных на развіццё творчых здольнасцей, мовы і ўяўлення вучняў дапаможнай школы. (Дадатак 5)

Мы прывыклі да даўно вядомых і лагічна завершаных канцовак казак. А што калі змяніць канцоўку казкі? Гэты прыём карысны і цікавы тым, што мы можам, змяняючы канец казкі, накіраваць увагу дзіцяці ў патрэбнае педагагічнае русла, развіваць уяўленне, ламаючы ўстаноўленныя стэрэатыпы.

“Заканчваем казку”. Сутнасць гэтага метадычнага прыёму заключаецца ў тым, каб дзеці прыдумалі канцоўку да казкі. Для гэтага прапаную вучням пачатак прыдуманай мною казкі. Напрыклад: «Пайшла дзяўчынка Алеся ў госці да бабулі перадаць гасцінцы ад мамы. Ішла яна доўга па лесе і заблудзілася. Доўга блукала яна па лесе, пакуль не сустрэла зайца. Вось заяц ёй і кажа…». Вучням неабходна самім працягнуць казку ў адпаведнасці з сэнсам.

“Казка з дапамогай малюнкаў”. Сутнасць работы заключаеецца ў тым, што па серыі малюнкаў вучням прапаную не толькі расказаць пра герояў, якія намаляваны на малюнках, але і паразважаць, што адбываецца вакол.

“Інцэніроўка казкі”. Пры інсцэніраванні казкі, імкнуся задзейнічаць вучняў усяго класа, падрыхтаваць патрэбныя касцюмы. Ролі размяркоўваем з улікам індывідуальных асаблівасцей дзяцей і характару саміх персанажаў казкі. Гэты від работы заўсёды выклікае зацікаўленасць, садзейнічае ўмацаванню добразычлівах адносін паміж вучнямі. Пры інсцэніроўцы казак часта выкарыстоўваю лялечны тэатр.

Свой уклад у фарміраванне нацыянальнай свядомасці вучняў уносіць этнаграфічны пакой “Беларуская хатка”, які з`яўляецца падмуркам рэалізацыі выхаваўчых мэт і магутным сродкам фарміравання інтарэсу да роднай мовы і культуры. Гэта тая прыступка, дзе ў працэсе навучання і выхавання вучань далучаецца да багацця нацыянальнай культуры, спасцігае і асэнсоўвае свае карані, спазнае скарбонку народнай мудрасці.

З гэтай нагодай, па ініцыятыве педагагічнага калектыву і адміністрацыі ўстановы у 2012 годзе быў створаны этнаграфічны пакой “Беларуская хатка”, галоўнай мэтай якога стала выхаванне вучня-грамадзяніна, які паважае і ведае спадчыну сваіх бацькоў, гісторыю роднага краю, родную беларускую мову, які шануе і зберагае беларускія традыцыі.

І вось адзін за адным у нашым пакоі з’явіліся экспанаты. Гэта былі саматканыя посцілкі і вышываныя ручнікі з бабульчыных куфэркаў, гліняныя гладышы і гаршкі, драўляныя начоўкі, лапці і шмат іншых рэчаў, якія раней служылі людзям. З цягам часу колькасць экспанатаў толькі павялічваецца.

Каб цікавасць да этнаграфічнага пакоя не трацілася, вялікую ўвагу надаю пытанню правільнай арганізацыі экскурсій для вучняў рознага ўзросту. Мной быў напісаны сцэнарый-прэзентацыя, які праінсцэніравалі вучні старэйшых класаў. Вочы вучня свецяцца радасцю і зацікаўленасцю тады, калі ідзе прадстаўленне ў пакоі. Немагчыма, трымаючы ў руках рэчы, выробленыя стагоддзе назад, не адчуваць пачуццё гонару за багатую культурную спадчыну.

Тут можна не толькі пачуць цікавую гісторыю пра старыя рэчы, але і ўбачыць работы ўмельцаў. Адна справа бачыць першабытныя прылады працы на фотаздымку ў падручніку, і зусім іншая – патрымаць у руках гэтыя рэчы.

Найбольш якаснае фарміраванне інтарэсу да вывучэння роднай мовы ў вучняў адбываецца менавіта праз практычную дзейнасць. Дзеці з задавальненнем прасуюць бялізну з дапамогай валка і качалкі; заўсёды шмат жадаючых пакруціць кола калаўрота.

Нягледзячы на тое, што этнаграфічны пакой “Беларуская хата” расказвае аб жыцці і прыладах працы нашых продкаў, іх мастацкіх здольнасцях, імкнуся да таго, каб кола інтарэсаў вучняў пашыралася, каб традыцыі народнага фальклора знайшлі свой працяг ва ўстанове. Тут праводзяцца святы: “Калядкі”, “Масленіца”, “Гуканне вясны”, “Саракі”, “Дажынкі”, урокі-святы па тэмах: “Беларуская хата”, “Беларусь – краіна Майстроў”, “Звычаі і традыцыі” і інш.

У традыцыю ўваходзіць правядзенне ў пакоі класных гадзін, пазакласных мерапрыемстваў: “Беларускіх вячорак”, “Беларускія народныя гульні”, “Заручыны”, “Народнае адзенне”, “Рамёствы”, “Традыцыі і звычаі беларускага народа”, “Нашы знакамітыя землякі” і гд.

**2.3 Выніковасць і эфектыўнасць вопыту**

Апіраючыся на крытэрыі развіцця пазнавальнага інтарэсу правяла дыягностыку вучняў VI-X класаў дапаможнай школы, якая паказала, што значна павялічылася колькасць вучняў, якім характэрны сярэдні ўзровень сфарміраваннасці пазнавальнага інтарэсу (62%), на 24% паменшылася колькасць вучняў, у якіх назіраецца узровень ніжэй сярэдняга. (Дадатак 4)

Адной з асноўных форм дыягностыкі пазнавальнага інтарэсу у вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю, з'яўляецца назіранне. Грунтуючыся на асабістых назіраннях прыйшла да высновы, што ў ходзе выкарыстання фальклору на ўроках літаратурнага чытання, павысіўся пазнавальны інтарэс вучняў. Яны з задавальненнем ідуць на ўрок, сталі больш уважлівымі. Назіраецца наяўнасць пазнавальных пытанняў, эмацыянальная зацікаўленнасць дейнасцю. Вучні сталі актыўнымі ўдзельнікамі на ўроку.

Ускосным адлюстраваннем росту інтарэсу да навучання з'яўляецца рост паспяховасці па вучэбным прадмеце " Літаратурнае чытанне".

Вышэйсказанае дазваляе зрабіць вывад, што выкарыстанне фальклору на ўроках літаратурнага чытання спрыяе павышэнню пазнавальнага інтарэсу да вывучэння беларускай мовы, што, безумоўна, уплывае на якасць вучэбнага працэсу, на фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі, нацыянальнай самасвядомасці вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю.

**3.Заключэнне**

У працэсе адраджэння нацыянальнай культуры і самасвядомасці важнае месца належыць фальклору – асноўнаму мастацкаму багаццю нашых продкаў, дзякуючы якому захоўваецца пераемнасць традыцый, ажыццяўляецца сувязь пакаленняў і бесперапыннасць духойнага развіцця нацыі.

Практычнае выкарыстанне фальклору на ўроках літаратурнага чытання як сродка формíравання пазнавальнага інтарэсу вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю да вывучэння беларускай мовы было прадстаўлена на паседжанні праблемнай групы настаўнікаў старэйшых класаў “Сучасныя тэхналогіі” і ў ходзе адкрытых урокаў у ДУА “Ваўкавыская дапаможная школа-інтэрнат” у рамках падрыхтоўкі да паседжання педагагічнага савета.

Дадзены педагагічны вопыт можа быць выкарыстаны не толькі настаўнікамі, але і выхавальнікамі школы-інтэрната ў пазаўрочнай рабоце. Кожны педагог індывідуальна можа выбраць метады і прыёмы, улічваючы індывідуальныя і псіхалагічныя асаблівасці вучняў, найбольш эфектыўнага выкарыстання фальклору ў сваёй дзейнасці.

Перспектывы развіцця педагагічнай дзейнасці:

- папаўненне метадычнай скарбонкі найбольш эфектыўнымі метадамі і прыёмаў выкарыстання фальклору пры авалоданні роднай мовай;
- распрацоўка метадычных рэкамендацый для педагогаў ўстановы па выкарыстанню фольклору з мэтай фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі, нацыянальнай самасвядомасці вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Жуковіч, М.В. Сучасныя педагагічныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры: дапаможнік для настаўнікаў / М.В.Жуковіч. — Мінск: Аверсэв, 2007.

2. Івановіч, А.У. Крынічка народнай творчасці / А. У. Івановіч, А. А. Сабіч. – Мн.: Беларусь, 2013. – 221 с.

3. Калачова, І.І. Этнапедагагічныя традыцыі і іх выкарыстанне ў сучасным выхаванні / І.І. Калачова // Праблемы выхавання. – 1997. - № 6. - С. 107

4. Мартынкевіч, С.В. Развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы (5-6 клас): вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання / С. В. Мартынкевіч. — Мінск: Выд.цэнтр БДУ, 2010.

5. Паўлоўская, В.І. Мова: цікава і займальна / В.І. Паўлоўская. – Мінск, 1997.

6. Саўко, У.П. Развіццё маўлення школьнікаў пры вывучэнні марфалогіі/ У.П.Саўко – Мінск, 2000.

7. Специальная педагогика: учебное пособие для студентов высших педагогических учебных заведений / [и др.]; под ред. . — М. : Изд. центр "Академия", 2000. — 400 с.

8. Шчукіна Г. І. Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў у вучэбнай дзейнасці/ Г. І. Шчукіна. - М: Асвета, 1979. – 190с.

Дадатак 1

**Характарыстыка узроўняў пазнавальнага інтарэса навучэнцаў старэйшых класаў дапаможнай школы**

| Кры-тэрый | **Узроўні** | | |
|---|---|---|---|
| | Ніжэй сярэдняга | Сярэдні | Вышэй сярэдняга |
| **рэгулятыўны** | Вучань нязасяроджаны, увага няўстойлівая, навучальны матэрыял урока не запамінае, пры цяжкасці бяздзейнічае | Эпізадычная засяроджанасць увагі вучня, сочыць за асноўнымі этапамі ўрока, можа паўтарыць галоўную думку ўрока, пры ўзнікненні цяжкасцей звяртаецца па дапамогу | Вучань засяроджаны, праяўляе высілак, цікаўнасць, імкнецца самастойна пераадолець цяжкасці, запамінае асноўны змест урока |
| **змястоўна-дзейнасны** | Навучэнец пасіўны падчас урока, адсутнічае самастойнасць у выкананні заданняў, праяўляецца эпізадычны інтарэс да прадмета, абумоўлены знешняй яго прывабнасцю, неабходнасцю атрымання добрай ацэнкі або непасрэднай сувяззю з прадметам яго цікавасці | Актыўнасць вучня на ўроку і ў пазаўрочны час залежыць ад ступені яго ўключэння настаўнікам у дзейнасць, самастойна выконвае заданні па вядомых яму ўзорам, назапашаныя веды абмяжоўваюцца рамкамі школьнай праграмы | Праяўляе актыўнасць і самастойнасць як падчас урока, так і ў пазаўрочны час, усталяванне заканамер- ностей, здольны пераносіць наяўныя веды ў незнаёмую сітуацыю |
| **эмацыянальны** | Неўраўнаважаны эмацыянальны стан навучэнца, абыякавасць можа змяняцца негатыўным выплескам эмоцый, рэдка назіраецца праяўленне станоўчых эмоцый | Эмацыйны стан роўны, сітуатыўная праява станоўчых эмоцый | Прыўзняты настрой, яркая праява станоўчых эмоцый |

Дадатак 2

**Тэст для дыягностыкі ўзроўню развіцця пазнавальнага цікавасці ў вучняў**

| № | Выказванне | Адзнакі | | |
|---|---|---|---|---|
| | | **0** | **1** | **2** |
| 1. | Я чакаю урака літаратурнага чытання | | | |
| 2. | У мяне на ўроку пераважае добра настрой | | | |
| 3. | Я самастойна выконваю дамашняе заданне | | | |
| 4. | Мне падабаецца прымаць удзел у конкурсах на ўроку | | | |
| 5. | Я чытаю дадаткавыя кнігі па беларускай літаратуры | | | |
| 6. | Я ўважліва слухаю настаўніка | | | |
| 7. | Я стараюся выконваць заданні да канца | | | |
| 8. | Я звяртаюся да настаўніка за дапамогай | | | |
| 9. | Я памятаю змест ўрока пасля яго завяршэння | | | |
| 10. | Я стараюся выконваць заданні без дапамогі насаўніка | | | |
| 11. | На ўроку я ўважліва слухаю пытанні настаўніка і імкнуся на іх адказаць | | | |
| 12. | Я з задавальненнем наведваю бібліятэку | | | |
| 13. | Мне падабаецца выконваць творчыя заданні на ўроку | | | |
| 14. | Я імкнуся працаваць самастойна | | | |
| 15. | Мне падабаецца размаўляць на беларускай мове пасля ўрока | | | |

Тэст складаецца з 15 выказванняў, якія вучням прапануецца ацаніць па 3-бальнай шкале: 0 – не (рэдка), 1 – часам, 2 – да (часта).

**Апрацоўка вынікаў тэсту**

| **Максімальная колькасць балаў-30 балаў** | |
|---|---|
| **Колькасць балаў** | **Узровень пазнавальнага інтарэса** |
| 0–14 | Ніжэй сярэдняга |
| 15–23 | Сярэдні |
| 24-30 | Вышэй сярэдняга |

Дадатак 3




Дадатак 4



Дадатак 5

**ТЭМА : Беларуская народная казка "Суп з сякеры"**

КЛАС: 8

ЗАДАЧЫ:

• сродкамі драматызацыі, ролевага чытання спрыяць выяўленню ўнутраных якасцей персанажаў казкі, раскрыццю іх характарыстыкі, узнаўленню абставін, праз якія разгортваецца фабула казкі;

• на матэрыяле казкі - спрыяць стварэнню ўмоў для развіцця звязнага маўлення;

• адпрацоўваць інтанацыйную выразнасць маўлення, навыкі пабудовы дыялогаў;

• праз арганізацыю выставы кніг "Беларускія народныя казкі" фарміраваць цікаўнасць да чытання кніг на роднай мове.

АБСТАЛЯВАННЕ:

мультымедыйная прэзентацыя, карткі для індывідуальнай працы, вучэбны дапаможшк А.М. Змушко "Літаратурнае чытанне" 8 клас, драўляныя лыжкі, чыгунок, дзіцячыя малюнкі, слоўнікавыя словы, выстава кніг "Беларускія народныя казкі", экспанаты з этнаграфічнага пакоя, прадукты харчавання (соль, крупа і інш,), ацэначныя лісты, простыя алоўкі.

ТЫП УРОКА: нетрадыцыйны

ХОД УРОКА

I. АРГАНІЗАЦЫЯ ПАЧАТКУ ЎРОКА

1. Псіхаэмацыяналъны настрой "Герлянда пажаданняў" (слайд 1)

***Ад слова***
***Вырастаюць крылы,***
***А ў сэрцы***
***Стукае любоў.***
***Ад слова***
***Прыбываюць сілы.***
***Дык не шкадуйце шчырых слоў!*** С. Грахоўскі

Давайце паглядзім адзін на аднаго, усміхнемся і пажадаем усім добрых і шчырых слоў. Скажам хорам “ Мы жадаем вам…” , а потым кожны з вас выкажа сваё слова-пажаданне.

Я таксама вам жадаю поспехаў у працы, прыемнага і радаснага настрою на працягу ўсяго урока.

II. ПРАВЕРКА ДАМАШНЯГА ЗАДАННЯ

Начнем наш урок з праверкі дамашняга задання. Якое дамашняе заданне вы рыхтавалі?

Калі ў жыцці выкарыстоўваюцца такія жанры фальклору як пацешкі? Лічылкі? Заклічкі?

Паслухаем, як вы навучыліся чытаць або расказваць іх на памяць.

( Вынік праверкі дамашняга задання. Адзнакі.)

Ці падабаюцца вам пацешкі, лічылкі, забаўлянкі?

Малайцы, вы добра падрыхтаваліся да ўрока. Пастаўце ў ацэначных лістах сабе балы: хто расказаў на памяць - 5 балаў, хто прачытаў - 4 балы.

Я ўпэўнена, што вы добра запомнілі пацешкі, забаўлянкі і лічылкі і будзеце карыстацца імі ў час гульняў, раскажыце сваім сябрам, малодшым брацкам і сястрычкам.

III. ПАДРЫХТОЎКА ДА ЎСПРЫМАННЯ НОВАЙ ТЭМЫ:

Тэма ўрока схавалася ў вершаваных радках, паслухаўшы якія. вы павінны здагадацца, што мы будзем чытаць на ўроку.

***Усім вядома без падказкі:***
***Дзеці вельмі любяць...(казкі) (***Слайд №6)

І сапраўды, усе мы любім чытаць казкі. Перш, чым мы пачнем знаёміцца з казкай, я загадаю вам загадку.

***Хоць і ростам невялікая,***
***А да гонару прывыкла я:***
***Перада мной дубы, і клёны,***
***І бярозы б'юць наклоны. (Адказ сякера) (***Слайд №7)

Якую працу можна выканаць з дапамогай сякеры?

А што яшчэ можна зрабіць з дапамогай сякеры, мы даведаемся, калі паслухаем беларускую народную казку “Суп з сякеры”

IV. ПЕРШАСНАЕ ЩСПРЫМАННЕ ТВОРА

Чытанне казкі настащникам. Адказ на щстановачнае пытанне.

V. ЧЫТАННЕ ПА ЧАСТКАХ. АНАЛІЗ ТВОРА. СЛОЎНІКАВАЯ РАБОТА

**1 -я частка**

Куды зайшоў салдат?

Што было ў яго торбе?

А б чым спытаў салдат сустрэчнага мужыка?

Што азначае слова "харчы"( Слайд №9)

**2 -я частка**

Да каго зайшоў салдат?

Што папрасіў салдат у скупой бабы?

Ці есць незразумелыя словы?

Што азначае слова "скупая"? "( Слайд №10)

**3 -я частка**

Што адказала баба салдату?

Чаму яна падманула салдата?

Ці ёсць незразумелыя словы?

Што азначае слова "гумно", "клець"? "( Слайды №11 і 12)

**4 -я частка**

Якім чынам пачаў варыць супсалдат?

**5 -я частка**

Што яшчэ папрасіў салдат у бабы?

Што азначае слова "памулялася" "( Слайд №13)

**6-я частка**

Ці смачны суп атрымаўся ў салдата?

Ці ўдалося салдату перахітрыць скупую бабу?

Як яму гэта ўдалося?

VI. ЗРОКАВАЯ ГІМНАСТЫКА

Сядзьце зручна і падумайце аб чым-небудзь прыемным.

***“Жмуркі”***. Моцна зажмурце вочы на 5 хвілін.

***“Матылёк”.*** Памаргайце вочкамі, як матылёк крыльцамі: хутка і лёгка.

***“Светлафор”.*** Па чарзе закрывайце то левае, то правае вока, як мігае чыгуначны светлафор.

***“Ходзікі”.*** Вочы глядзяць то ўправа, то ўлева, як ходзікі "Цік - так"

***Намалюем вачамі*** вялікі круг: паглядзелі на столь, на акно, на падлогу, на дзверы; і ў другі бок - на дзверы, на столь , на акно, на падлогу.

І яшчэ раз ***“Матылёк”.***

VII. САМАСТОЙНАЕ ЧЫТАНЕ

1.Заданне для чытання

Вучні, у якіх карткі зяленага колеру - знаходзяць словы салдата

Вучні, у якіх карткі сіняга колеру - знаходзяць словы бабы

Астатнія дзеці чытаюць тэкст казкі і стараюцца запомнщь, як салдат варыў суп з сякеры

2. Самастойная праца

3. Праверка (чытанне казкі по асобах)

4.Праца з ілюстрацыей патручніка

VIII. КАЛЕКТЫЎНЫ ПЕРАКАЗ КАЗКІ З ЭЛЕМЕНТАМІ ДРАМАТЫЗАЦЫІ:

А зараз мы з вамі наведаемся ў госці да бабы і паспрабуем зварыць суп з сякеры (вучні заходзяць у этнаграфічны пакой)

Вось прыблізна ў такой хаце жыла баба ў тыя далекія часы. Як вы думаеце, што займала самае галоўнае, пачэснае месца ў сялянскай хаце? (Печ)

Пра яе вельмі добра расказаў у сваім вершы вядомы дзіцячы пісьменнік В. Вітка:

***Дзіўная рэч - хто першы на ўспаміне?***
***Ну, вядома, печ, яна тут гаспадыня.***
***Старым на печы добра пагрэць плечы,***
***А малым узімку і плечы, і спінку*** ( урывак з верша чытае падрыхтаваны вучань)

Вось у такой печы салдат варыў суп. Што зрабіў салдат, калі зайшоў у хату?

(Ён прывітаўся і папрасіў паесці)

Давайце паспрабуем пераказаць гэту казку, праінсцэніраваць урывак: зварыць суп. (Вучні пераказваюць казку ад імя бабы і салдата, выконваюць дзеянні з рэальнымі прадметамі: чыгун, сякера, вада, соль, крупы, сала, цыбуля) .

Паставім суп варыцца у печ, а самі зойдзем у клас і сядзем на свае месцы

IX. ХАРАКТАРЫСТЫКА ГАЛОЎНЫХ ГЕРОЯЎ

Чаму салдату прыйшлося варыць суп з сякеры?

Дайце характарыстыку галоўным героям, выбярыце патрэбныя словы:

***Салдат: здагадлівы, добры, смелы***
***Баба: добрая, разумная, скупая*** **(**Слайд №15, 16)

Абгрунтуйце свае думкі.

X. ВЫНІК УРОКА. АДЗНАКІ. ( АЦЭНАЧНЫЯ ЛЮТЫ)

З якой казкай пазнаёміліся на ўроку?

Чаму вучыць тэта казка?

XI. ДАМАШНЯЕ ЗАДАННЕ

Вучні, у якіх карткі сіняга і зяленага колеру - навучыцца чытаць і пераказваць казку.

Усе астатнія - чытаюць казку і адказваць на пытанні падручніка.

Усе мы любім казкі. Любім іх чытаць, слухаць, глядзець, маляваць фрагменты. Калі вас зацікавілі беларускія народныя казкі, іх можна ўзяць у нашай школьнай бібліятэцы і прачытаць (звяртаемся да выставы кніг).

***Рэфлексія:***

Калі вы лічыце, што ўрок прайшоў для вас цікава, вы добра працавалі - пакладзіце лыжкі ў чыгунок.

Калі яшчэ не ўсё атрымалася, было складана разабрацца - пакладзіце лыжкі побач з чыгунком.

Я таксама пакладу сваю лыжку ў чыгунок. Дзякуй за працу!

***І дзякуем казцы за добрыя словы,***
***Што падарыла нам Родная мова!*** (Слайд №17)